УДК 330.322:330.131.7

# РОЛЯ ІНВЕСТЫЦЫЙ У ЗАБЯСПЯЧЭННІ ЭКАНАМІЧНАЙ БЯСПЕКІ

В. В. БОСАК, магістр экан. навук
В. М. БОСАК, д-р с.-г. навук, прафесар

УА «Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія»,
Горкі, Рэспубліка Беларусь

**Уводзіны.** У сучасных умовах закладам устойлівага развіцця эканомікі любой краіны з’яўляецца высокая інвестыцыйная актыўнасць. Інвестыцыі належаць да важнейшых крыніц развіцця вытворчай базы, садзейнічаюць структурным змяненням у эканоміцы, забяспечваюць бесперапынны эканамічны рост, што, у рэшце-рэшт, садзейнічае паспяховай рэалізацыі сацыяльна-эканамічных мэтаў краіны [1, 10, 11, 15, 19].

**Асноўная частка.** За апошнія дзесяцігоддзі адзначаецца тэндэнцыя да паглыблення канкурэнцыі за глабальныя інвестыцыі. Краіны вымушаны шукаць шляхі па прыцягненню прамых замежных інвестыцый для інтэнсіфікацыі працэсаў інтэграцыі ў сусветную гаспадарку. З гэтай мэтай прымаюцца высілкі па стварэнню спрыяльных умоў для інвестыцый, у тым ліку па лібералізацыі інвестыцыйнай палітыкі, пашырэнню эканамічных свабод гаспадарчых суб’ектаў, наданню ільгот і прэферэнцый [13].

Павелічэнне інвестыцыйнай прывабнасці краіны і найлепшае выкарыстанне канкурэнтных пераваг з’яўляецца сур’ёзным выклікам для ўраду і патрабуе распрацоўкі і рэалізацыі складаных і комплексных мер як інвестыцыйнай палітыкі ў прыватнасці, так і эканамічнай палітыкі ўвогулле.

Існуюць наступныя віды інвестыцый:

– па аб’екту інвеставання: рэальныя, фінансавыя, спекулятыўныя;

– па асноўных мэтах інвеставання: непасрэдныя (прамыя), партфельныя, нефінансавыя, інтэлектуальныя;

– па форме ўласнасці на інвестыцыйныя рэсурсы: прыватныя, дзяржаўныя, замежныя, змешаныя;

– па тэрмінах інвеставання: кароткатэрміновыя, сярэднетэрміновыя, доўгатэрміновыя.

Сярод розных відаў інвестыцый асаблівае месца займаюць прамыя замежныя інвестыцыі, важная роля ў прыцягненні якіх адводзіцца

спецыяльным установам – агенцтвам па прыцягненню інвестыцый, якія закліканы дапамагчы замежным інвестарам у вядзенні бізнесу ў краіне-рэцэпіенце [2, 4, 7, 8, 12].

Патрэбна, аднак, адзначыць, што міжнародныя інвестыцыі аказваюць як станоўчы, так і адмоўны ўплыў на эканоміку краін-рэцэпіентаў.

Да асноўных станоўчых эфектаў адносяць:

– павелічэнне тэмпаў эканамічнага росту;

– рост вытворчасці працы;

– прыцягненне і развіццё новых перадавых тэхналогій, замежнага досведу;

– павелічэнне расходаў на даследаванні;

– перадача патэнтаў і ліцэнзій;

– дыверсіфікацыя і развіццё знешнегандлёвай дзейнасці;

– узмацненне канкурэнцыі;

– павелічэнне ўзроўню занятасці, кваліфікацыі працоўных рэсурсаў;

– павелічэнне даходаў дзяржаўнага бюджэту і г. д.

Сярод адмоўных наступстваў можна адзначыць:

– узмацненне эканамічнай і палітычнай залежнасці ад краін-інвестараў;

– рызыка страты кантролю дзяржавы над асобнымі галінамі і сектарамі нацыянальнай эканомікі;

– выцясненне ўнутраных капіталаўкладанняў і нацыянальных вытворцаў;

– рэпатрыяцыя капіталу;

– рызыка дэфармацыі структуры нацыянальнай эканомікі;

– культурныя змяненні ў краіне-рэцэпіенце.

Розніца паміж адмоўным і станоўчым эфектамі для прымаючага боку складае чысты вынік (эфект), які можа быць атрыманы ад прыцягнення прамых замежных інвестыцый.

Для вылічэння інвестыцыйнай прывабнасці той ці іншай краіны ацэньваюць інвестыцыйны клімат з выкарыстаннем розных методык (напрыклад, сістэмы падтрымкі прыняцця рашэнняў (СППР), метада шкаліравання і г. д.) [3, 6, 9, 14–20].

Для нашай краіны найбольшую цікавасць па пытаннях прыцягнення замежных інвестыцый мае досвед краін з трансфармацыйнай эканомікай (краіны пост-савецкай прасторы, Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропы), што абумоўлена геаграфічнай

блізкасцю, агульным гістарычным мінулым з шэрагам краін, падобным узроўнем эканамічнага развіцця. Акрамя таго, нельга не адзначыць неабходнасць вывучэння досведу тых краін, якія дамагліся значнага прагрэсу ў прыцягненні замежных інвестыцый [5].

У краінах Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропы, а таксама ў краінах ЕАЭС існуе шырокая сетка інвестыцыйных стымулаў для інвестараў. Розныя ільготы і прэферэнцыі надаюцца ў свабодных (асобых, спецыяльных) эканамічных зонах, прамысловых і тэхналагічных парках, інавацыйных парках, у межах структурных фондаў. Інвестары маюць таксама права на атрыманне натуральных грантаў і зварот інвестыцый, падатковыя і мытныя ільготы, субсідыі са спецыяльных фондаў і г. д.

**Заключэнне.** Аб’ектыўная ацэнка інвестыцыйнага клімату краіны, якая ўключае аб’ектыўныя магчымасці рэгіёна ці краіны (інвестыцыйны патэнцыял) і ўмовы дзейнасці інвестара (інвестыцыйная рызыка) пры магчымасці супастаўлення гэтых паказчыкаў з’яўляецца важнейшым інструментам прыцягнення замежных інвестыцый, якія, у сваю чаргу, служаць забяспячэнню паспяховага эканамічная развіцця і эканамічнай бяспекі дзяржавы.

ЛІТАРАТУРА

1. Анализ инвестиционной привлекательности организации / Д. А. Ендовицкий [и др.]. – Москва: КноРус, 2017. – 374 с.

2. Босак, В. В. Инвестиционные агентства: опыт функционирования / В. В. Босак // Вестник БГЭУ. – 2018. – № 1. – С. 53–60.

3. Босак, В. В. Инвестиционные стимулы и преференциальные режимы: характеристика и значение / В. В. Босак // Экономика и управление производством. – Минск: БГТУ, 2018. – С. 14.

4. Босак, В. В. Особенности организации инвестиционной деятельности в Республике Беларусь / В. В. Босак, В. Н. Босак // Вестник Алтайской науки. – 2014. – № 4. – С. 100–103.

5. Босак, В. В. Особенности привлечения иностранных инвестиций в странах с трансформационной экономикой / В. В. Босак // Актуальные проблемы науки XXI века. – 2018. – № 7. – С. 71–76.

6. Босак, В. В. Особенности принятия инвестиционных решений с использованием СППР / В. В. Босак, В. Н. Босак // Экономика и управление производством. – Минск: БГТУ, 2016. – С. 56.

7. Босак, В. В. Оценка развития инвестиционной деятельности в Республике Беларусь / В. В. Босак // Актуальные проблемы инновационного развития агропромышленного комплекса Беларуси. – Горки: БГСХА, 2020. – С. 8–11.

8. Босак, В. В. Перспективы развития регионального рынка инвестиций / В. В. Босак, В. Н. Босак // Экономическое развитие региона: управление, инновации, подготовка кадров. – 2016. – № 3. – С. 73–76.

9. Босак, В. В. Применение СППР в процессе принятия инвестиционных решений / В. В. Босак // Информационные технологии: теория, опыт, проблемы, перспективы. – Горки: БГСХА, 2018. – С. 23–24.

10. Босак, В. В. Роль банковского сектора в формировании инвестиционных ресурсов Республики Беларусь / В. В. Босак, В. Н. Босак // Экономическое развитие региона: управление, инновации, подготовка кадров. – 2015. – № 2. – С. 64–66.

11. Босак, В. В. Совершенствование инвестиционной деятельности в Республике Беларусь / В. В. Босак, В. Н. Босак // Экономика и управление производством. – Минск: БГТУ, 2015. – С. 79.

12. Босак, В. В. Функции и институциональные формы инвестиционных агентств / В. В. Босак, В. Н. Босак // Экономика и управление производством. – Минск: БГТУ, 2017. – С. 86.

13. Мировой опыт стимулирования инновационного развития экономики: механизмы, инструменты, перспективы адаптации для Республики Беларусь / Д. В. Муха [и др.]. – Минск: Беларуская навука, 2020. – 378 с.

14. Пакуш, Л. В. Использование преференциальных режимов для повышения инвестиционной активности / Л. В. Пакуш, В. В. Босак // Актуальные проблемы инновационного развития агропромышленного комплекса Беларуси. – Горки: БГСХА, 2018. – С. 163–166.

15. Пакуш, Л. В. Оценка инвестиционного климата страны / Л. В. Пакуш, В. В. Босак // Веснік Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова. Серыя D. Эканаміка, сацыялогія, права. – 2019. – № 1. – С. 4–11.

16. Пакуш, Л. В. Применение СППР для оценки преференциальных режимов / Л. В. Пакуш, В. В. Босак // Веснік Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова. Серыя D. Эканаміка, сацыялогія, права. – 2018. – № 1. – С. 4–10.

17. Пакуш, Л. Инвестиционный климат: особенности и выбор методик оценки / Л. Пакуш, В. Босак // Актуальные проблемы инновационного развития агропромышленного комплекса Беларуси. – Горки: БГСХА, 2019. – С. 65–69.

18. Смеянович, О. Ф. Совершенствование организации расчетных операций в банковском секторе Республики Беларусь / О. Ф. Смеянович, В. Н. Босак // Экономическое развитие региона: управление, инновации, подготовка кадров. – Барнаул: АГУ, 2015. – С. 215–217.

19. Шмарловская, Г. А. Инвестиционный климат Республики Беларусь и стратегия привлечения иностранных инвестиций / Г. А. Шмарловская, Е. Н. Петрушкевич. – Минск: Дикта, 2012. – 159 с.

20. Bosak, V. V. Dynamik der internationalen Investitionen der Republik Belarus / V. V. Bosak, A. A. Bosak // Научный потенциал молодежи – будущему Беларуси. – Пинск: ПолесГУ, 2010. – С. 223–225.

! Проанализирована роль инвестиций в обеспечении устойчивого экономического развития и экономической безопасности. Дана характеристика инвестиций, показано их положительное и отрицательное значение.

! ! инвестиции, инвестиционный климат, преференциальные режимы, экономическая безопасность.